— “Вакханка”, р-р 308 x 128 см. Национальный музей в Кракове, собрание Гартарийских, инв. № МНК XIII — 1335.

— “Геркулес”, р-р 306 x 125 см. Королевский замок в Варшаве, Фонд им. Теханавецких.

— “Собесский под Веной”. Полесье или Волынь, конец XVIII в., мастерские Ализаров; лен, шерсть, шелк; плотность 9 нитей, осн. / р-р 210 x 430 см. Государственное собрание предметов искусства на Вавели, инв. № 7552.

— “Сцена перед корчмой”. Полесье или Волынь (1720—1743 гг.), мастерские Ализаров; лен, шерсть, шелк, плотность 8—9 нитей, осн. / р-р 303 x 165 см. Музей Ягеллонского университета, инв. № 870-233 / IV.

**В.У.Сярдзюк,**
*аспірантка*

## ДЭСАКРАЛІЗАЦЫЯ СВЯТА Ў СЕКУЛЯРНЫМ ГРАМАДСТВЕ

Сёння гавораць пра страту духоўнасці ў сучасным грамадстве, пра глабальную секулярызацыю ўсіх бакоў жыцця, пра маральны крызіс. Разглядаючы з’яву свята ў сучасных абставінах, можна вызначыць ідэалы грамадства, даведацца, ці сапраўды грамадства секулярызуецца.

Падкрэслім асаблівасць азначэння прадмета гутаркі: “свята” ад “святы”, “свяціць” — сакральнае, якое належыць да звышрэальнага свету, “найвышэйшы ўзровень развіцця духоўнай культуры...” [3, с. 23], “сукупнасць звычаяў і абрадаў, якія выяўляюць і замацоўваюць пэўныя погляды... адносіны людзей да прыроды і паміж сабой”[6, с. 455].

У любой справе, тым больш у свяце, стрыжнем з’яўляюцца мэтанакіраванасць, ідэя, звышзадача, сэнс. Гэта значыць, што якое б ні было свята (палітычнае, аграрнае, нацыянальнае ці рэлігійнае), у аснове сваёй яно павінна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

змяшчаць нейкі універсальны пачатак. Коратка прааналізуем падмуркі разнастайных свят. Усе народныя (аграрныя) святы заснаваны на кульце продкаў і кульце прыроды – цыклічным адраджэнні жыцця, сямейныя – на абароне і дапамозе членам абшчыны, грамадскія – на шанаванні вырашальных момантаў гісторыі. Свята дапамагае вызначыць і пераадолець пэўны крызіс, пераломны момант высокай напружанасці. Па сведчанні Ж.Батая, "абрад – згустак чалавечага жыцця – інтымнага"[1, с. 36]. Мы бачым, што свята з'яўляецца свядома сакралізаванай часткай штодзённага секулярнага чалавечага жыцця.

Дзюркгейм падкрэсліваў, што "... у любога свята, нават цалкам свецкага, выяўляюцца рысы, характэрныя да рэлігійных падзей... кожнае свята звязана з пэўнай каштоўнасцю, часам з каштоўнасцю вышэйшага парадку, якая з'яўляецца святыняй (sacrum) для святкуючай групы" [2, с. 126]. Свецкія ўрачыстасці маюць свае святыні і цырымоніі: узгадаем яскравы прыклад рэвалюцыйных свят і рытуалізацыю савецкай святочнай культуры. Такім чынам, абазначым тэрмінам "sacrum" галоўны арганізуючы элемент свята, які катастрафічна выпустошваецца ва ўмовах секулярнага свету, вынішчаючы і сам інстытут свята, і назавем гэта дэсакралізацыяй свята – стратай святам свайго свяшчэннага пачатку.

Прасочым, якім чынам трансфармуецца свята ў секулярным свеце. Звернемся да пратэстанцкага тэолага Х.Кокса. У сваёй працы "Feast of fools" ("Свята дурняў") ён, падобна Хейзінге, які "...недвухсэнсоўна абвясціў канец свята і свяшчэннай гульні ў індустрыяльным грамадстве..." [5, с. 56], прызнае факт глыбокага крызісу свята і святочнасці ў буржуазным грамадстве, у выніку чаго "...сучасныя святочныя ўрачыстасці ўжо больш не аб'ядноўваюць людзей, як гэта было раней, не звязваюць іх ні з прыродай, ні з гісторыяй духоўных пошукаў чалавецтва, ні з сацыяльнай гісторыяй" [5, с. 55]. Вытокі змянення свята ў буржуазным

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

грамадстве Х.Кокс бачыць у развіцці індустрыялізацыі і дакладных ведаў, якія прывялі да матэрыяльна-тэхнічнага прагрэсу, з'яўлення вялікай колькасці рэчаў пры адначасовым заняпадзе рэлігійнай свядомасці, яе секулярызацыі. «Страта заходнім чалавекам існай веры ("смерць бога"), культ працы і рацыянальнага» [5, с. 55] прывялі да крызісу свята.

Такі стан святочнасці ў секулярнай культуры абумоўлены некалькімі фактарамі: новы рытм працы, іншыя скорасці, незалежнасць ад прыродных цыклаў, спажывецкія адносіны да культуры, прыналежнасць індывіда да многіх супольнасцей (нацыянальнай, канфесійнай, прафесійнай, сацыяльнай і інш.) пры адначасовай "ананімнасці", якія павялічваюць кола свят для ўдзелу адной асобы і памяншаюць адказнасць і сур'ёзнасць удзелу ў іх. Анахранізмам сталі былыя забароны, звязаныя са святкаваннем, асабліва традыцыйны пост, бо яны не адпавядаюць патрабаванням новага працоўнага рытму. Свята выходзіць за рамкі былых тэрмінаў, губляючы характар сакралізавання прасторы і часу святкавання. "Распаўсюджанасць забаў розных відаў, напрыклад танцаў, музыкі, відовішчаў, якія спрадвеку прызначаліся для святочных перыядаў, а зараз сталі даступныя незалежна ад календара, значна паменшыла прывабнасць свята ў гэтым плане, зрабіла забавы штодзённымі, звычайнымі" [2, с. 269]. Хаця СМІ імкнуцца стварыць святочную атмасферу, падкрэсліваюць адрозненне ўрачыстых дзён ад іншых дзён, усё ж сучасны стыль жыцця дэсакралізуе культуру, змяншае эмацыянальную прывабнасць святочнага перыяду.

Паглядзім на свята з боку карыснасці. Наш час вельмі рацыянальны і прагматычны. "Кожны святочны дзень, свабодны ад працы, роўны, на думку эканамістаў, мільёнам страчаных каштоўнасцей, якіх чакаюць на рынку" [2, с. 268]. На ментальным узроўні ідзе паслабленне культу продкаў (на якім базіруюцца многія дзяржаўныя, рэлігійныя святы) і гісторыі як нерацыянальных, непрактычных, таксама адсюль ігнараванне сакральнага сэнсу смерці і нараджэння, што



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбіваецца на характары святкавання. Неперспектыўныя ў фінансавым плане святы адмяняюць для дзяржаўнага святкавання (напрыклад, як стала са святам Божага цела ў каталіцкай Італіі), некаторыя выкарыстоўваюцца для атрымання прыбытку, становяцца нагодай для масавага спажывання праз гандаль. Своеасаблівай спажывецкай істэрыяй з'яўляюцца каляды: "...узгадаць толькі пра чысты жах нашых калядных свят, калі нашы дзеці разрываюць адзін пакет за другім і калі падлога ўжо завалена падарункамі і пакункамі, яны ўсклікаюць: і гэта ўсё?" [2, с. 293].

Наглядаецца праблема страты людзьмі ўмення святкаваць. На думку навукоўца Л.А.Тульцавай, выраслі новыя пакаленні, не далучаныя да жывой сялянскай культуры і выхаваныя на спажывецкіх адносінах да яе [5, с. 58]. "Свята становіцца відовішчам як для яго непасрэдных удзельнікаў і іншаземных турыстаў, так і для мільёнаў тэлегледачоў" [2, с. 294]. Гэтыя святы — сімулякры, яны збіраюць людзей, якіх нішто не звязвае, апрача жадання пазабавіцца. Рэклама выкарыстоўвае страту сэнсу свята, займаючы яго месца, і sacrum з ідэі ператвараецца ў прадукт, рэч для продажу і спажывання. Узгадаем для прыкладу рэкламную акцыю "Смага", якая праходзіць штогод у Мінску пры вялікім зборы народу. Пэўны сэнс у свяце саступае месца прымітыўнай рэкламе; святочныя атрыбуты, такія як багатая ежа і напоі, разгул, сталі яго сэнсавай асновай.

Свята магчыма праводзіць толькі калектыўна, яно патрабуе энергіі і адданасці, выканання пэўных абавязкаў і роляў, свята робіць свабоду адноснай і не можа разглядацца як свабодны, належны толькі індывіду час. У індустрыяльным жа свеце назіраюцца аслабленне пачуцця грамадскіх сувязей, імкненне індывіда ізаляваць сябе ў коле асабістых праблем, увайсці ў сферу прыватнага жыцця ў нерабочы час: "Там, дзе прыватнае жыццё, права на ізаляцыю, служэнне сваім інтарэсам і капрызам становіцца вышэйшай каштоўнасцю чалавека, сама ідэя свята як грамадскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інстытута, формы сумеснага жыцця адкідваецца незалежна ад таго, пра якое канкрэтна свята ідзе гаворка — рэлігійнае, нацыянальнае ці палітычнае” [2, с. 279]. Раўнадушша да свят ёсць вынік раўнадушша да ідэй, каштоўнасцей, з якімі звязаны пэўныя святы.

Х.Кокс бачыў сімптомы “выздараўлення” святочнай культуры Захаду ва ўзнаўленні духу святочнасці і фантазіі маладзёжных рухаў. Таксама ён прапанаваў звязаць рэлігійнае свята і яго абраднасць з мастацкім неаавангардызмам, з камічным, далучыць сюды палітычны момант [4]. Тут мы бачым чыста постмадэрнісцкае вырашэнне праблемы, якое яшчэ больш паглыбляе яе. Справядліва адзначаючы неабходнасць ажыўлення старых і вынаходніцтва новых сэнсаў, Х.Кокс, аднак, не прапануе рэальна магчымага выхаду з сітуацыі дэсакралізацыі свята.

Улічваючы тое, што чалавечая прырода кансерватыўная, а сацыяльнасць незнішчальная, што чалавек не можа без каштоўнасцей, сэнсаў і святыняў, можна спадзявацца на ўзнаўленне свята менавіта зыходзячы з яго сакральнай асновы. Дэсакралізацыя свята, а гэта значыць страта святам сэнсаў і сімвалаў, сведчыць пра страту ў грамадстве веры ў гэтыя сімвалы, зніжэнне іх значнасці. На нашу думку, узнаўленне сапраўднага свята магчыма на лакальным і больш шырокім ўзроўні пры супадзенні аксіялагічных і семантычных установак удзельнікаў свят з іх ідэямі і сэнсам.

---

1. *Батай Ж.* Теория религии. Литература и Зло /Пер. с фр. Ж.Гайковой, Г.Михалковича. – Мн.: Современный литератор, 2000. – 352с.

2. *Жигульский К.* Праздник и культура. – М.: Прогресс, 1985. – 336 с.

3. *Ліцвінка В.Д.* Святы і абрады беларусаў. – Мн.: Беларусь, 1997. – 176 с.

4. *Мазаев А.И.* Праздник как социально-художественное явление: опыт историко-теоретического исследования. – М.: Наука, 1978. – 392 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Тульцева Л.А.* Традиционные верования, праздники и обряды русских крестьян. – М.: Знание, 1990. – 63 с.

6. *Святы* і святочныя дні / М.Ф.Пiлiпенка // Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя – Мн.: БелЭн, 1989. – С. 455–456.

**В.В.Трамбицкий,**
*ст. преподаватель*

## ПРОБЛЕМЫ ДУХОВНОСТИ ЛИЧНОСТИ В СОВРЕМЕННОМ ОБЩЕСТВЕ

Прогресс в сфере знаний видоизменяет человеческую деятельность. Современные информационные технологии имеют значение не только на глобальном уровне, на уровне судеб цивилизаций, но и на уровне образования, здравоохранения, финансов и бизнеса. Их значение обусловлено растущей властью знания и информационных технологий. Последние способны оказывать влияние на экономическую жизнь (темп банковских и биржевых операций) и социокультурную среду.

В современном мире процесс компьютеризации является симптомом социокультурного прогресса, способствует ускорению экономических процессов. В таких условиях к работникам предъявляются совершенно иные требования: способность к творческому труду, восприимчивость к инновациям. Контроль над информацией усиливает реальную власть как в экономической, так и в политической сферах.

Одним из характерных признаков социального прогресса в современной информационной цивилизации выступает процесс медиатизации, т. е. сплошного охвата коммуникациями всего населения, включая отдельных индивидов. Благодаря этому у личности появляются новые возможности интенсификации своей деятельности, открывается доступ каждой личности к информации.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ